Голас Радзімы

№ 16 (1742)
22 красавіка 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



5 мая, калі ў Савецкай краіне будзе адзначацца Дзень друку, у старажытным Нясвіжы адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка выдатнаму беларускаму асветніку, гісторыку і філосафу XVI стагоддзя Сымону Буднаму. Славуты наш продак горда ўзняў надрукаваную ім кнігу — «Катэхізіс» — і быццам запрашае ўсіх хто здольны ацаніць вартасць пачатай справы, прадоўжыць яе.

Аўтар помніка — нядаўняя выпускніца Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, малады скульптар, аспірантка Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР Святлана ГАРБУНОВА, якую вы бачыце на здымку. Дарэчы, пра яе мы пісалі ў нашай газеце. Хочацца прыгадаць чытачу, што работу над помнікам Святлана распачала яшчэ ў інстытуце, калі была студэнткай. А пазней падарыла скульптуру гораду Нясвіжу, дзе некалі жыў і працаваў Будны. Святлану Гарбунову як творцу цікавяць асобы славутых дзеячаў культуры Беларусі, яе нацыянальных герояў, што ўславілі родны край і свой народ. Цяпер яна рыхтуе эскізы да помніка Уладзіславу Сыракомлі, ёсць іншыя цікавыя ідэі, якія з часам увасобяцца ў новых работах С. Гарбуновай.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

АДКАЗ Л. І. БРЭЖНЕВА НА ПЫТАННЕ КАРЭСПАНДЭНТА «ПРАВДЫ»

Пытанне: У ходзе адной з гутарак з журналістамі прэзідэнт ЗША Р. Рэйган закрануў пытанне аб магчымасці сустрэчы з Вамі ў Нью-Йорку. Гэтыя яго выказванні выклікалі супярэчлівыя каментарыі.

Якая Ваша думка наконт гэтага?

Адказ: Сапраўды, выказванні прэзідэнта пакінулі даволі расплыўчатае ўражанне.

Што датычыць сутнасці справы, то ў дакладзе на XXVI з'ездзе КПСС я ўжо гаварыў аб карысці актыўнага дыялога са Злучанымі Штатамі Амерыкі на ўсіх узроўнях, асабліва падкрэсліўшы, што рашаючае звяно тут — сустрэча на самым высокім узроўні. Мы і сёння за такія сустрэчы. Зразумела, што сустрэча паміж амерыканскім прэзідэнтам і мной павінна быць добра падрыхтавана і праведзена па-саліднаму, а не мімаходам у сувязі з тым або іншым міжнародным форумам.

Гаворачы больш канкрэтна, мы за правядзенне такой савецка-амерыканскай сустрэчы на вышэйшым узроўні, якая адпавядала б высокай адказнасці нашых дзяржаў за становішча спраў у свеце і апраўдала б ускладаемыя на яе надзеі.

Адносна месца і часу нашай магчымай сустрэчы з прэзідэнтам Р. Рэйганам я б сказаў наступнае.

Сустрэча магла б адбыцца ў якой-небудзь трэцяй краіне, скажам, у Фінляндыі або Швейцарыі, зразумела, з папярэдняй згоды адпаведнага ўрада. Падыходзячым тэрмінам, на мой погляд, можа быць восень гэтага года, напрыклад, кастрычнік.

Такі мой адказ на пастаўленае пытанне. Як мне ўяўляецца, ён зусім ясны і дакладны.

ПАДЗЕІ • ЛЮДЗІ • ФАКТЫ

З ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР СМА

На працягу двух дзён у Мінску знаходзіўся генеральны сакратар Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) прафесар А. К. Віін-Нільсен. Ён быў прыняты намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР І. Глазковым, які расказаў госцю аб рэспубліцы, дасягненнях яе працоўных у рэалізацыі сацыяльна-эканамічных задач адзінаццатай пяцігодкі. У ходзе гутаркі абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з дзейнасцю СМА.

У Беларускім рэспубліканскім упраўленні па гідраметэаралогіі і кантролю прыроднага асяроддзя прафесар А. К. Віін-Нільсен азнаёміўся з тэхнічнымі дасягненнямі калектыву. Адбылася сустрэча з работнікамі гідраметэаслужбы рэспублікі.

Генеральны сакратар СМА наведаў мемарыяльны комплекс «Хатынь», Курган славы і спорткомплекс у Раўбічах.

ВЫСТАЎКІ

ДЭМАНСТРУЕ ФІРМА «ХОМАГ»

Высокапрадукцыйныя станкі і абсталяванне для дрэваапрацоўчай прамысловасці заходнегерманскай фірмы «Хомаг» сталі экспанатамі выстаўкі, якая праходзіла ў Мінску. На прэс-канферэнцыі намеснік генеральнага дырэктара ўсесаюзнага аб'яднання «Экспацэнтр» Я. Якаўлеў паведаміў журналістам, што ў выстаўцы прымаюць удзел 17 машынабудаўнічых прадпрыемстваў фірмы. Пачатак яе дзелавых сувязей з нашай краінай быў пакладзен 7 гадоў назад. «Хомаг» пастаўляе сваё абсталяванне і для дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў Беларусі.

Савецкі Саюз, сказаў у сваім выступленні дырэктар фірмы «Хомаг» О. Хорнбергер, з'яўляецца нашым актыўным і надзейным гандлёвым партнёрам. Прадстаўленае на гэтай выстаўцы абсталяванне, падкрэсліў ён, добра адлюстроўвае сучасныя напрамкі яго развіцця — аўтаматызацыю і камп'ютэрызацыю.

ЮБІЛЕІ

ЛЕТАПІС ТВОРЧЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

Газеце «Літаратура і мастацтва» — паўстагоддзя. За плённую работу па развіццю савецкай літаратуры і мастацтва, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў.

З гэтай нагоды 13 красавіка ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы адбыўся ўрачысты сход. З прамовай на ім выступіў кандыдат ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Кампартыі Беларусі Ц. Кісялёў.

Ён адзначыў, што газета стала летапісцам культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы, прапагандыстам лепшых твораў нашых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, дзеячаў тэатра і кіно, барацьбітом за высокую ідэйнасць літаратуры і мастацтва.

Ц. Кісялёў зачытаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні «Літаратуры і мастацтва» ордэнам Дружбы народаў і ўручыў высокую ўзнагароду.

Выступіўшы на сходзе галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» А. Жук падкрэсліў, што ўзнагарода азначае прызнанне дасягненняў усёй беларускай літаратуры, мастацтва, культуры. Расказаў аб этапах развіцця беларускай савецкай літаратуры, якія знайшлі сваё дастойнае адлюстраванне на старонках газеты, аб праблемах развіцця мастацтва і культуры, што заўсёды хвалявалі шырокі калектыў яе аўтараў.

Ад імя творчых саюзаў БССР газету-юбіляра з высокай узнагародай павіншавалі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. Гілевіч, а таксама першы намеснік рэдактара «Литературной России» А. Егарунін, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Литературная Украина» С. Грачанюк, галоўны рэдактар літоўскай газеты «Літаратура ір мянас» О. Алекс і іншыя.

ПРАПАНАВАЛІ ВУЧОНЫЯ

ЯК ЗАГАРТОЎВАЮЦЬ СТАЛЬ

Арыгінальны спосаб умацавання вырабаў з вугляродзістай сталі нарадзіўся ў Фізіка-тэхнічным інстытуце Акадэміі навук Беларусі.

Вядома, што магнітныя ўласцівасці гэтай сталі слабеюць з павышэннем тэмпературы. Гэтую асаблівасць металу даследчыкі прапанавалі выкарыстаць для высокадакладнага рэгулявання разагрэву пры загартоўцы інструмента. Пры гэтым яго стойкасць павялічваецца ўдвая ў параўнанні з умацаваннем, што дасягаецца з дапамогай традыцыйных спосабаў тэрмаапрацоўкі.

Новаўвядзенне, укаранёнае ў Мінскім вытворчым аб'яднанні імя У. І. Леніна, замяніла працяглы працэс загартоўкі матрыц штампаў у печах. З яго дапамогай умацоўваюцца толькі рэжучыя кромкі інструмента, што дазваляе выключыць наступную механічную апрацоўку, эканоміць электраэнергію, час.

УЛАДКОЎВАЕМ БЫТ

НА ПРЫРОДНЫ ГАЗ

Інтэнсіўна вядуць работы па падачы прыроднага газу ў жылыя дамы абласнога цэнтра спецыялісты вытворчага аб'яднання «Магілёўаблгаз». Усяго тры месяцы назад на ўскраіне горада быў запален факел, які абвясціў, што газаправод-адвод Орша — Магілёў даўжынёй 90 кіламетраў дзейнічае.

За гэты час прыродны газ прыйшоў у 1 100 кватэр мікрараёнаў Мір-1 і Мір-2. У недалёкім часе ён паступіць яшчэ ў 1 200 кватэр.

На чарзе — газіфікацыя заводаў «Строммашына» і металургічнага. У перспектыве прыродным газам будуць карыстацца амаль сто прадпрыемстваў і арганізацый Магілёва. Ён прыйдзе таксама ў сто тысяч кватэр магіляўчан.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

Гэты высокі, сучасных архітэктурных форм будынак добра вядомы ў Салігорску. Сюды, у новы Дом быту, прыходзяць заказаць касцюм або абутак, звязаць модную сукенку або світэр. Тут таксама можна адрамантаваць сумачку, чамадан, аддаць адзенне ў хімчыстку. А ўсяго тут аказваюць цяпер 34 віды новых паслуг.

НА ЗДЫМКУ: новы Дом быту ў Салігорску.

На поўдні рэспублікі пачалася выбарачная сяўба ранніх каласавых культур. У ліку першых вывелі свае агрэгаты на палі механізатары калгаса «Ленінскі сцяг» Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці.

НА ЗДЫМКУ: сяўба яравых у калгасе.

ЯК НАРОДНЫЯ МАСЫ КІРУЮЦЬ ДЗЯРЖАВАЙ

САВЕЦКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ: РЭАЛЬНАСЦІ І ПРАБЛЕМЫ

Галоўны крытэрый узроўню дэмакратыі ў грамадстве—фактычны, самастойны і рашаючы ўдзел народных мас у кіраванні ўсімі дзяржаўнымі і грамадскімі справамі. Такі ўдзел становіцца магчымым пры сацыялізме, калі, як адзначаў У. І. Ленін, «Маса насельніцтва ўзнімаецца да самастойнага ўдзелу не толькі ў галасаваннях і выбарах, але і ў штодзённым кіраванні».

НЕФАРМАЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

Перш за ўсё неабходна спыніцца на ролі авангарда грамадства — КПСС. У палітычнай сістэме СССР Камуністычная партыя Савецкага Саюза — тая сіла, якая пастаянна стымулюе і накіроўвае развіццё і ўдасканальванне народаўладдзя. Ніводзін колькі-небудзь сур'ёзны крок у дэмакратызацыі грамадскага развіцця не абыходзіцца без актыўнага ўдзелу КПСС. Напрыклад, за апошнія гады па ініцыятыве грамадскіх арганізацый былі прыняты многія важныя законы і пастановы партыі і ўрада, накіраваныя на паляпшэнне ўмоў працы, быту і адпачынку працоўных. Толькі за некалькі месяцаў, што прайшлі пасля XXVI з'езда КПСС, Цэнтральны Камітэт разгледзеў і адобрыў больш за 700 ініцыятыў і пачынаў, якія нарадзіліся ў працоўных калектывах краіны. Аб гэтым сведчыць таксама і тая ўвага, якую пастаянна праяўляе ЦК КПСС да работы з пісьмамі і скаргамі працоўных у партыйных і дзяржаўных органах і сродках масавай інфармацыі. Так, у апошнія гады Цэнтральны Камітэт прыняў некалькі пастаноў аб рабоце з пісьмамі працоўных. За час паміж XXV (1976) і XXVI (1981) з'ездамі партыі ў ЦК КПСС, напрыклад, паступіла звыш 3,2 мільёна пісем і вусных зваротаў і 15 мільёнаў разгледзелі партыйныя камітэты на месцах.

Маштабы ўдзелу ў вырашэнні дзяржаўных і грамадскіх спраў цяпер, на этапе развітога сацыялізму, дасягнулі небывалых раней памераў. Напрыклад, у абмеркаванні праекта новай Савецкай Канстытуцыі, прынятай у 1977 годзе, непасрэдна ўдзельнічала звыш 140 мільёнаў чалавек, гэта значыць больш чатырох пятых дарослага насельніцтва краіны. Актыў Саветаў народных дэпутатаў — органаў прадстаўнічай дэмакратыі, у якія выбрана амаль 2,3 мільёна дэпутатаў, складае сёння звыш 30 мільёнаў чалавек. Гэта азначае, што кожны пяты-шосты дарослы жыхар СССР пастаянна ўдзельнічае ў рабоце органаў дзяржаўнай улады і кіравання. За апошнія дзесяць гадоў Саветы прынялі да выканання 3 мільёны 250 тысяч наказаў насельніцтва.

Грамадзяне ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі і праз органы народнага кантролю, якія спалучаюць у сабе дзяржаўны і грамадскі кантроль за работай органаў кіравання і службовых асоб. Аснову гэтай сістэмы складаюць групы і пасты (1,3 мільёна) на прамысловых прадпрыемствах і будоўлях, у калгасах і саўгасах, ва установах, міністэрствах і ведамствах. У арганізуемых імі праверках удзельнічаюць мільёны актывістаў — рабочых, сялян і служачых. Яны правяраюць, як выконваюцца планавыя заданні, змагаюцца з парушальнікамі дзяржаўнай дысцыпліны, безгаспадарчасцю, праявамі бюракратызму і валакіты. Пастаянны кантроль за захаваннем працоўнага заканадаўства і арганізацыяй аховы працы ажыццяўляе самая масавая грамадская арганізацыя — прафсаюзы, якія маюць 6 200 штатных інспектараў і, акрамя таго, 3 мільёны чалавек, што працуюць на грамадскіх пачатках.

Навыкі кіравання вытворчасцю працоўныя набываюць у пастаянна дзеючых вытворчых нарадах, якія выбіраюцца на сходах рабочых і служачых. Цяпер у СССР больш за 139 тысяч такіх нарад, якія аб'ядноўваюць каля шасці мільёнаў чалавек, амаль дзве трэці з іх — рабочыя. Яны разглядаюць пытанні планавання, укаранення новай тэхнікі на прадпрыемствах, уносяць прапановы і прымаюць рашэнні, выкананне якіх абавязкова для гаспадарчых кіраўнікоў. За два апошнія гады

ДАДАТАК Ў СЯМЕЙНЫ БЮДЖЭТ

ХТО ПРАЦАВІТЫ, ТОЙ САМАВІТЫ

Тэму гэтага артыкула падказаў выпадак. Нядаўна давялося мне быць у камандзіроўцы ў вёсцы Мурава на Пружаншчыне. Збіраў матэрыял пра фальклорна-этнаграфічны салон, які плённа дзейнічае пры тутэйшым Доме культуры. Аднаго разу ішлі мы з намеснікам старшыні мясцовага калгаса імя Калініна Міколам Дабрадзеем вуліцамі Мурава. Ён з гордасцю расказваў, што іх гаспадарка ў ліку перадавых па вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў сярод дваццаці трох калгасаў раёна, прыводзіў прыклады заможнасці калгаснікаў. А яны былі на вачах: амаль на кожным падворку гараж для аўтамабіля ці матацыкла, над дахамі тэлевізійныя антэны, ды і самі хаты калгаснікаў выглядаюць, як тут гавораць, дыхтоўна.

Але мне ў вочы кінулася тое, што знешне заможнасць сядзіб розная. Я сказаў пра гэта свайму спадарожніку.

— Нічога дзіўнага, — адказаў ён, — справа ў тым, што адзін чалавек больш гаспадарлівы і пасля работы ў калгасе не лянуецца папрацаваць дома — для сябе ж, другі ж аддае перавагу адпачынку ля тэлевізара ці на канапе — у каго які характар.

— Значыцца, — пытаюся, — той, хто жыве на адзін толькі заробак ад грамадскай гаспадаркі, лічыцца на вёсцы, мякка гаворачы, лайдаком?

— Вядома ж — не! І ніхто яго не папракае за тое, што чалавек не хоча корпацца ва ўласным агародзе ці хляве. Як жыць, яго асабістая справа, абы ў ладзе з законам. Тут зусім іншае: не «лайдак», раз мы ўжо ўзялі гэтае слова, жыве ў два разы багацей. І каштуе тое багацце яму зусім нямнога. Але, думаю, пра гэта вам раскажа сам такі гаспадар.

Мы заходзім на падворак Мікалая Казлоўскага. Вялікая хата ўпрыгожана рознымі будаўнічацяслярскімі мудрагельствамі, паўз яе і клуню пралягае да гаража цэментная сцежка, побач з хатай стаіць невялікая цагляная пабудова — летняя кухня і лазня. Агарод добраўпарадкаваны, грушы і яблыні, што растуць на ім, ахайныя, пабеленыя. Усё сведчыць пра гаспадарлівасць і працавітасць сям'і Казлоўскіх.

Заходзім у хату: на падлозе і сценах дываны, стаіць сучасная мэбля, шыкоўны тэлевізар, халадзільнік, на паліцах серванта крышталь, розны посуд.

Гаспадыня ветліва запрашае ў гасціны пакой, усаджвае на покуце. Калі даведваецца пра прычыну нашага прыходу, здзіўляецца, разгублена пазірае на мужа. А той, наадварот, трымаецца з гэткім гонарам, маўляў, вось я які!

Прашу Мікалая Казлоўскага расказаць пра сваю сям'ю, працу, гаспадарку.

— Мы са старэйшым сынам Віктарам, — гаворыць ён, — працуем у калгасе будаўнікамі, жонка Вольга санітарнічае ў школе-інтэрнаце, малодшы сын Васіль яшчэ вучыцца ў дзесятым класе. Усе разам зарабляем трохі больш за 4 000 рублёў у год. Даход немалы, жыць можна. І жыць не бедна. Але ж чалавек імкнецца да лепшага.

— У нас, калі хто жыве заможней, значыць работнік добры, — тлумачыць намеснік старшыні. — Вось, да прыкладу, наш гаспадар. З сорак дзевятага года працуе ў калгасе, за гэты час столькі заслужыў падзяк, ганаровых падарункаў ад кіраўніцтва, што і не пералічыш.

Мікалай Казлоўскі гэтыя словы начальніка сустракае ўсмешкай. Ён не любіць, каб яго хвалілі. Жонка ж на мужа глядзіць з павагай.

— Ён у нас не толькі добры працаўнік, гаспадар, але і муж і бацька на пяць балаў, — гаворыць яна.

— Хоць пры чужых людзях пахваліш, — смяецца Мікалай Сямёнавіч.

— Ну, а зараз, — прашу я гаспадара, вынімаючы з кішэні нататнік і ручку, — калі ласка, раскажыце пра вашу гаспадарку і даход ад яе.

— Гэта 25 сотак пад палеткі, дзе садзім бульбу, гародніну, буракі. Далей — карова і бычок, дзве свінаматкі з прыплодам, парасяты на закол, куры. Так што, як бачыце, і не дужа. У іншых болей. Які ж памер даходу ў грашах за год?

Зараз падлічым.

Малака — на 450, бычок — 500, парасяткі — 1 000, свінні — 1 000, яйкі — 340, куры — 90, бульба — 840, гародніна — 200, садавіна — 500, грыбы, ягады — 700 рублёў.

Агульны рахунак 5 620 рублёў. Цяпер адмінусуем 620 рублёў на корм для жывёлы — гэта на бульбу, муку, камбікармы, зерне, а сена, салома калгаснікам даюцца бясплатна. У выніку 5 тысяч чыстага даходу.

— Але ж утрыманне такой гаспадаркі займае шмат часу, — гавару я.

— На чатырох самае большае ў сярэднім паўтары-дзве гадзіны ў дзень. Раніцой жонка, перад тым як ісці на работу, пакорміць жывёлу, у абед Васіль, ён акурат у гэты час прыходзіць са школы, увечары ўжо мы з Віктарам — шыхуем парнік, носім бульбу, дровы...

— Мікалай Сямёнавіч, як запраўскі планавік, усе работы па гаспадарцы размеркаваў паміж членамі сям'і, — жартуе Дабрадзей.

— А як жа іначай, цяпер без планавання ні ў лес, ні па дровы.

— Ну і колькі ж грошай вы назапасілі? — пытаюся я, хоць і ведаю, што задаю нясціплае пытанне.

— Не лічылі, — смяецца гаспадыня, — але, калі Віктар будзе жаніцца, кааператыўную кватэру пабудуем, дый малодшаму на машыну будзе.

Выйшаўшы з хаты Казлоўскіх, я запытаўся ў Міколы Дабрадзея:

— Па колькі ж грошай людзі маюць?

— Сказаць дакладна цяжка, але бясспрэчна, многа. У Мураве 240 двароў. 12 сямей ужо маюць аўтамабілі, яшчэ каля 60, ведаю, збіраюцца купіць. Амаль у кожнай сям'і — па матацыклу, а то і па два. Напрыклад, Хайкі з суседняй вёскі Ізбіцы — на трох чалавек — муж, жонка, дачка — маюць машыну і матацыкл з каляскай.

— Ды і вы самі жывяце няблага. Пры ўласным аўтамабілі...

— І пры гаспадарцы — карова, свінні, куры, агарод, пчолы. Мой спадарожнік зірнуў на гадзіннік. — Праз нейкую гадзіну-другую трэба ісці ўпраўляцца, дапамагаць жонцы.

— А кім яна працуе? — пытаюся.

— Настаўніцай у нашай школе, выкладае ў пачатковых класах.

Працавіты народ жыве ў Мураве. Заможны. У гэтым я пераконваўся і бачачы сялянскія сталы. Чаго толькі няма на іх! І мяса, і сала, і каўбасы, і марынаваныя гуркі, і кансерваваныя грыбы, і варэнне. І ўсё гэта не з крамы, а — гаспадыні пастараліся.

Мікола ШЭЛЯГОВІЧ.

Паспяхова працуе на Брэсцкім электралямпавым заводзе брыгада спецыялістаў венгерскай фірмы «Тунгсрам». Сумесна з інжынерамі і наладчыкамі прадпрыемства яна зманціравала тут тры высокапрадукцыйныя аўтаматычныя лініі, а цяпер заканчвае наладку чацвёртай. Кожная з іх выдае за змену 16 тысяч лямп.

НА ЗДЫМКАХ: венгерскія спецыялісты са сваімі сем'ямі ў Музеі абароны Брэсцкай крэпасці; адладку абсталявання вядуць венгр Эндрэ ЛАЦЫФІ і беларус Васіль САЦ; за кубачкам кавы сустрэліся сем'і мантажніка Шандара БАКАДЗІ, майстра завода Аляксандра СУХАВА і наладчыка Аляксея ЛУКА.

Фота Э. КАБЯКА.

«МАЛЮТКА» НАКІРОЎВАЕЦЦА Ў ВЁСКУ

Машынавыпрабавальная станцыя размешчана непадалёку ад Мінска. Тут атрымалі пуцёўку ў жыццё вядомыя ва ўсім свеце трактары «Беларусь». Новыя мадэлі гэтага праслаўленага сямейства машын і зараз трымаюць экзамен. Побач з колавымі волатамі — трактар-малютка, які канструктары назвалі мотаблокам «Беларусь МТЗ-05». Ён прызначаны для работы не толькі на прысядзібных участках, але і ў садзе, цяплiцах, на дачы. Адным словам, у асабістай гаспадарцы, дзе вырошчваецца немалая колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі, механічны конь прынясе вялікую карысць. Міні-трактар можа араць, баранаваць, культываваць, акучваць, перавозіць грузы. Акрамя універсальнасці, у яго ёсць і іншыя перавагі. Машына невялікая, лёгкая (вага — 130 кілаграмаў), простая ў абслугоўванні, эканомна расходуе паліва. Прадукцыйнасць мотаблока на ворыве — да 0,65 гектара ў гадзіну. Механізм мотаблока складаецца з двухколавага шасі, невялікага рухавіка магутнасцю чатыры конскія сілы. Зручная канструкцыя каробкі перамены перадач: шасцерні ў ёй пастаянна зачэплены. Трактар-малютка мае чатыры хуткасці ўперад і дзве назад. Найменшая хуткасць руху — крыху больш за два кіламетры ў гадзіну. Счапіўшы мотаблок з цялежкай, уладальнік можа «асядлаць механічнага каня», які развівае хуткасць да дзевяці кіламетраў. Зручна? Несумненна. Бо на сельгасработах даводзіцца часта транспарціраваць на розныя адлегласці і ўгнаенні, і насенне, і сельскагаспадарчы інвентар. Усе гэтыя клопаты возьме на сябе механічны памочнік. А восенню ён лёгка даставіць з поля сабраныя клубні, гародніну, фрукты...

Мотаблок «абуты», як і звычайныя трактары, у гумавыя колы, толькі значна меншых памераў.

Але ёсць і іншая мадэль, у якой механічныя колы з грунтазацэпамі. Яна можа спраўна пераадольваць забалочаныя глебы, крутыя схілы. Так што навінка атрымае прызнанне не толькі ў нашай рэспубліцы, але і на Паволжы, на Далёкім Усходзе, на поўдні і поўначы краіны. Зборка трактароў-малютак ідзе зараз на арганізаваным для гэтай мэты новым участку. Патрэбны дэталі каля двухсот назваў, 85 вырабляюцца на прадпрыемстве, а выпуск астатніх наладжваецца на іншых заводах не толькі Беларусі, але і суседніх рэспублік.

Як ацэньваюць навінку спецыялісты? Трэба сказаць, што ў яе былі нялёгкія выпрабаванні. Мотаблок праходзіў іх на Адэскай навукова-доследнай станцыі і вытрымаў экзамен на «выдатна». Камісія рэкамендавала мінскі міні-трактар да вытворчасці. А нядаўна галоўны камітэт ВДНГ СССР узнагародзіў беларускіх трактарабудаўнікоў — інжынераў-канструктараў «малюткі» Антона Кузняцова і Вячаслава Барадаўку бронзавымі медалямі, праца якіх атрымала высокую ацэнку спецыялістаў.

М. ДЫМ.

эканамічны эфект ад укаранення такіх прапаноў склаў 1,4 мільярда рублёў. Усё больш шырокі і актыўны ўдзел працоўных мас у кіраванні жыццём краіны трывала замацаваўся як цэнтральны напрамак палітычнага развіцця савецкага грамадства.

ЗАДАЧА — УЦЯГНУЦЬ УСІХ ГРАМАДЗЯН У КІРАВАННЕ ГРАМАДСТВАМ

Як будзе развівацца далей народаўладдзе? Артыкул 9 новай Канстытуцыі СССР адзначае, што далейшае разгортванне сацыялістычнай дэмакратыі — асноўны напрамак развіцця палітычнай сістэмы СССР. Гэта азначае «ўсё больш шырокі ўдзел грамадзян у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства, удасканальванне дзяржаўнага апарату, павышэнне актыўнасці грамадскіх арганізацый, узмацненне народнага кантролю, умацаванне прававой асновы дзяржаўнага і грамадскага жыцця, расшырэнне публічнасці, пастаянны ўлік грамадскай думкі».

Адсюль вынікаюць і тыя актуальныя праблемы, якія сёння вырашаюцца. Намечана мэта дасягнуць такога ўзроўню, каб усе грамадзяне прымалі ўдзел у кіраванні нефармальна і дастаткова прадукцыйна. Каб выканаць яе, КПСС, дзяржава, іншыя састаўныя часткі палітычнай сістэмы грамадства павінны вырашыць складаныя задачы па далейшаму пад'ёму агульнаадукацыйнага ўзроўню ўсіх грамадзян, павышэнню іх прафесійнай кваліфікацыі, навучанню навыкам палітычнай і арганізацыйнай работы. У гэтай сувязі распрацоўваецца комплекс канкрэтных палітыка-эканамічных, культурна-выхаваўчых і іншых мер, разлічаных на розныя групы насельніцтва.

Возьмем другую праблему — удасканальванне дзяржаўнага апарату як аднаго з напрамкаў далейшага развіцця дэмакратыі. Органы дзяржаўнай улады маюць і выкарыстоўваюць мноства магчымасцей прыцягнення шырокіх мас да сваёй дзейнасці. Гэта выбарнасць, прадстаўніцтва саставу, публічнасць дзейнасці, справаздачнасць дэпутатаў, актыў Саветаў народных дэпутатаў і г. д. Але гэтага сёння ўжо недастаткова. Намечана складаная работа, накіраваная на прыцягненне ўсіх працоўных да дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання. Паступова будзе ўводзіцца выбарнасць службовых асоб, праводзіцца перыядычная атэстацыя дзяржаўных служачых розных узроўняў, стане рэгулярнай справаздачнасць іх перад Саветамі народных дэпутатаў і насельніцтвам.

Не менш актуальна пытанне аб больш цесным узаемадзеянні дзяржаўных органаў з грамадскімі арганізацыямі. У сучасных умовах ужо недастаткова абмяжоўвацца удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый у пасяджэннях калегій міністэрстваў, выканаўчых камітэтаў Саветаў народных дэпутатаў, іх аддзелаў, камісій. У далейшым, верагодна, павялічыцца колькасць іх сумесных мерапрыемстваў. Грамадскім арганізацыям будуць даручаць выкананне новых асобных функцый дзяржаўных органаў.

Джангір КЕРЫМАЎ.

22 АПРЕЛЯ ИСПОЛНИЛОСЬ 112 ЛЕТ СО ДНЯ РОЖДЕНИЯ В. И. ЛЕНИНА

СОКРОВИЩНИЦА ВЕЛИКОГО НАСЛЕДИЯ

В Институте марксизма-ленинизма при ЦК КПСС (ИМЛ) собрана большая часть документального наследия Владимира Ильича Ленина. О продолжающемся поиске ленинских документов, об исследовательской работе, которую ведут сотрудники института в этом направлении, по просьбе корреспондента АПН Александра САПСАЯ рассказывает заместитель директора ИМЛ Дмитрий АНТОНЮК:

— В Институте марксизма-ленинизма хранятся в настоящее время более 34 тысяч рукописей, писем и документов Ленина. Здесь же, в архиве, около 400 его фотографий, 874 метра кинопленки, в кадрах которой был запечатлен Владимир Ильич. Институт имеет также 14 граммофонных пластинок с записями его речей. Почти 91 процент всех ленинских документов, собранных здесь,—это оригиналы (автографы, подлинники). Остальные представлены разнообразными копиями: машинописными, фотографическими и другими. Более тысячи документов, хранящихся в ИМЛ, написаны Лениным на девяти иностранных языках.

Кроме документов, в Институте марксизма-ленинизма собраны фонды и коллекции, дополняющие и раскрывающие содержание ленинских документов. В них, как правило, сведения биографического характера. Это — личные документы, письма в адрес Владимира Ильича, воспоминания о нем и другие.

— Дмитрий Иванович, расскажите, пожалуйста, о поиске новых ленинских документов. Какими путями он идет?

— В ленинском идейно-теоретическом наследии выявлено еще далеко не все. Продолжается активный поиск новых документов, автографов. И, надо сказать, поиск небезуспешный. Так, например, в результате систематической работы научных сотрудников по розыску ленинских документов за пять лет (с 1976 по 1980 год) в ИМЛ поступил 351 документ, включая 124 подлинника. В прошлом году найдено 82 новых документа.

Обширна география этого поиска. Только в последние годы ряд ленинских рукописей был выявлен историками в архивах Москвы, Ленинграда, Казани, Ульяновска, Красноярска, Свердловска, Пензы, Калуги, Тулы, Риги, Минска и других городов нашей страны. В результате скрупулезной работы ученых в Центральном государственном архиве Октябрьской революции в Москве было обнаружено более 40, в Центральном государственном архиве народного хозяйства свыше 20 и в архиве Министерства иностранных дел СССР около 20 ленинских автографов. Среди этих документов — датированные до Октября 1917 года письма Ленина из-за рубежа, телеграммы первых лет Советской власти за его подписью, его резолюции и указания на документах, поступивших от местных партийных и советских органов и организаций, документы, касающиеся восстановления железнодорожного транспорта, направления средств на развитие промышленности юго-востока России, развития водного транспорта страны и другие. Несколько новых документов с автографами Ленина, поступивших в ИМЛ в прошлом году, раскрывают его заботу о развитии производительных сил страны, выравнивании экономики и культуры народов РСФСР, Средней Азии, Закавказья и других республик.

Музеи—также важный источник поступления ленинских документов. Так, в фондах Музея-квартиры В. И. Ленина в Кремле, Центрального музея В. И. Ленина, музея Октябрьской революции в Москве и его филиала в Ленинграде и других советские историки обнаружили немало документов за подписью Владимира Ильича, книги с его пометками, его записки, телеграммы, а также документы членов семьи Ульяновых.

Источником пополнения ленинского документального наследия служат и библиотеки. Здесь проводится значительная работа по изучению книг, журналов и газет, которыми пользовался основатель Советского государства. Тщательно изучаются фонды Библиотеки имени В. И. Ленина в Москве, а также библиотек в Ленинграде, Красноярске и многих других городах страны и за рубежом.

Читательский билет В. И. Ленина с его автографом, датированный 1916 годом, недавно обнаружен советскими исследователями, работавшими в Социальном архиве Цюриха.

— Что можно сказать о международном сотрудничестве в розыске и приобретении новых ленинских документов?

— В области собирания и публикации литературного наследия основоположников научного коммунизма успешно развивается сотрудничество ИМЛ с научными учреждениями многих стран, сотнями зарубежных друзей. С их помощью был найден и получен институтом ряд новых документов Ленина, рукописи его произведений. Прочные научные контакты установил наш институт с подобными ему научно-исследовательскими учреждениями социалистических стран, а также с научно-исследовательскими центрами ряда коммунистических и рабочих партий капиталистических стран, с зарубежными архивными учреждениями. В последнее время научные сотрудники ИМЛ выезжали в США, Францию, Финляндию, Швейцарию, ФРГ, Норвегию, Италию, Грецию, Голландию. В результате установлены деловые контакты с рядом архивов этих стран.

Новые ленинские документы об основах миролюбивой внешней политики Союза ССР поступили из Норвегии. А книгу «Детская болезнь «левизны» в коммунизме» с дарственной надписью В. И. Ленина одному из деятелей американского рабочего движения начала 20-х годов Камениру передал в дар ЦК КПСС известный общественный деятель США Арманд Хаммер. Этот автограф — свидетельство прямых связей основателя Советского государства с представителями рабочего класса США в первые годы Советской власти.

Не так давно в архиве Лос-Анджелеса была обнаружена записка В. И. Ленина видному советскому политическому и государственному деятелю Л. Красину о целесообразности издания законодательных актов, способствующих расширению экономических и культурных связей молодой Страны Советов с зарубежными государствами. Документ передан на вечное хранение в наш институт.

Памятник В. И. Ленину в Столине.

пішуць землякі

АЎСТРАЛІЙЦЫ СУПРАЦЬ ПАЛІТЫКІ РЭЙГАНА

З даўняга часу Злучаныя Штаты Амерыкі служылі ўзорам для іншых капіталістычных дзяржаў. Аднак у апошнія гады іх прэстыж рэзка знізіўся. На мой погляд, велізарную ролю ў гэтым адыгрывае цяперашняя адміністрацыя ЗША, якую ўзначальвае прэзідэнт Рэйган. Палітыка, якую ён праводзіць, не толькі б'е па амерыканскіх працоўных, але і ставіць пад пагрозу інтарэсы многіх краін, цесна звязаных з ЗША ў эканамічнай і палітычнай галінах. Гэта адносіцца і да Аўстраліі.

Адміністрацыя Рэйгана бязлітасна зразае сродкі на розныя сацыяльныя патрэбы, каб укласці новыя мільярды долараў у агрэсіўную праграму перавзбраення. У сучасны момант лічба беспрацоўных у ЗША пераваліла за 9,5 мільёна чалавек, але «рэйганоміка» не прадугледжвае стварэння новых рабочых месц.

Аўстралійскія працоўныя добра ўсведамляюць, што ЗША імкнуцца дасягнуць абсалютнага сусветнага панавання. Гэта вынікае з палітычных акцый Вашынгтона ў Чылі, Сальвадоры і некаторых іншых дзяржавах, дзе самы рэакцыйны рэжым — фашызм падтрымліваецца самай «дэмакратычнай» у капіталістычным свеце краінай.

ЗША спрабуюць прасунуць сваю «дэмакратыю» і ў сацыялістычныя краіны. Як гэта робіцца, мы маглі бачыць на прыкладзе Польшчы, абранай амерыканскімі палітыканамі для стварэння анархіі і эканамічнага хаосу. Тут яны дзейнічалі рукамі рэакцыйных элементаў, якія маральна разлажыліся, як і іх натхніцелі, ставілі свае асабістыя выгады вышэй інтарэсаў уласнага народа. Сёння, дзякуючы рашучым дзеянням польскага ўрада, становішча ў краіне нармалізуецца. Каб пераадолець цяжкасці, што ўзніклі ў выніку хваляванняў, справакаваных адшчапенцамі, якіх натхняе Вашынгтон, польскаму народу спатрэбіцца нямала намаганняў і часу. Але адміністрацыя Рэйгана ніяк не можа змірыцца з правалам планаў павярнуць назад развіццё Польшчы, убіць клін паміж сацыялістычнымі дзяржавамі. ЗША зноў спрабуюць прымяніць эканамічныя санкцыі супраць сацыялістычных краін, прымушаюць і сваіх саюзнікаў уключыцца ў гэтую брудную гульню. Падобныя спробы рабіліся па розных прычынах і раней, але не давалі жаданых вынікаў. Большасць разумных людзей тут, у Аўстраліі, ды і ў іншых заходніх краінах лічаць, што такія дзеянні могуць толькі яшчэ больш падарваць прэстыж ЗША ў свеце і выклікаць незадаволенасць тых краін, якія маюць немалыя выгады ад эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам, іншымі сацыялістычнымі дзяржавамі.

Вярхі ў Аўстраліі спрабуюць ісці курсам ЗША. Аўстралійская эканоміка залежыць ад амерыканскай. У выніку і ў нас налічваецца 417 тысяч беспрацоўных. Усё больш людзей тут разумеюць, што падтрымка палітыкі Рэйгана не прынясе нам нічога добрага. Нават буйнейшая аўстралійская газета «Сідней Морнінг Геральд» апублікавала на першай старонцы артыкул пад назвай «Прэзідэнт Рэйган хоча вайны». З яго яскрава вынікае, што амерыканская адміністрацыя спрабуе паўсюдна ствараць канфліктныя сітуацыі. Асаблівая ўвага аўстралійцаў звернута на сутнасць апошніх палітычных крокаў Белага дома: планы эканамічнай вайны супраць сацыялістычных краін, агрэсіўныя планы размяшчэння новай зброі ў Еўропе. Аб выніках такой палітыкі ЗША можна меркаваць нават па наступным факце: прайшло амаль 40 гадоў з дня заканчэння II сусветнай вайны, але да гэтага часу ў краінах Еўропы знаходзяцца велізарныя кантынгенты амерыканскіх узброеных сіл.

Значная колькасць аўстралійцаў, як і большасць людзей на нашай планеце, хочуць міру і адхіляюць любое насілле аднаго народа над другім, усякую форму агрэсіі. Яны лічаць, што рух за мір, неўмяшанне ў справы іншых і мірнае суіснаванне ўсіх дзяржаў на зямлі павінны стаць асновай знешняй палітыкі Аўстраліі. Гэта дапаможа вырашыць і ўнутраныя праблемы — даць работу беспрацоўным, зменшыць інфляцыю, пакончыць са злачыннасцю, якая расце разам з ростам беспрацоўя. Разрадка і ператварэнне ў жыццё рашэнняў Хельсінкскай нарады — вось адзіны шлях захаваць мір на зямлі.

Г. ТОМПСАН-ТРАБІЦКОЙ.

Аўстралія.

АДКУЛЬ ІДЗЕ ЗЛО

Дарагія сябры! Вялікае дзякуй за газеты і брашуры, якія вы нам прысылаеце. Мы жывём удалечыні ад роднай старонкі, і гэта вельмі цяжка. Але як прыемна адчуваць сябе на далёкай чужыне не забытым сваёй Радзімай! Помню, як атрымаў ад вас календары. Паверце, колькі было радасці ад таго, што там, далёка, далёка, на роднай зямлі, хтосьці пра цябе помніць, думае, хоча зрабіць што-небудзь прыемнае. Гэтыя клопаты надаюць нам тут асаблівую бадзёрасць, прымушаюць зноў і зноў адчуваць, што ў цябе ёсць Радзіма. А такой Радзімай, як наша, нельга не ганарыцца. Яна ператварылася з вельмі адсталай краіны ў магутную дзяржаву.

Тут, на чужыне, нам цікава слухаць, што гавораць аб нашай Радзіме людзі. Вядома не тыя, хто верхаводзіць прапагандысцкай машынай і лье на яе ўсялякі бруд, а просты народ. Пастаянныя паклёпы на Савецкі Саюз адыгралі сваю ролю. Многія ім вераць. Але нам прыемна адзначыць, што з цягам часу погляды людзей мяняюцца. Вось нядаўна я ездзіў у Злучаныя Штаты наведаць свайго дзядзьку. Я быў там ужо не раз, і, натуральна, што маю знаёмых. Мы размаўлялі аб розных падзеях у свеце, і ў мяне было такое пачуццё, што гэтых людзей быццам хтосьці падмяніў. Хоць яны і цяпер не праяўляюць асаблівых сімпатый да Савецкага Саюза, але сваіх амерыканскіх падпальшчыкаў вайны крыюць, не саромеючыся, самымі апошнімі словамі. Раней ад гэтых людзей нічога падобнага нельга было пачуць. Цяпер жа яны расказвалі мне пра сваё будзённае жыццё, гаварылі, што багатыя багацеюць, а беднякі даходзяць да жабрацтва, што толькі па статыстыцы ў ЗША ўжо каля дзесяці мільёнаў беспрацоўных і што не злічыць бяздомных. Гаварылі, што капіталісты выціскаюць з працоўнага народа апошнія сокі, каб памножыць свае багацці, і што так больш працягвацца не можа. З гэтых размоў я зразумеў, што простыя людзі не падтрымліваюць палітыку кіруючых класаў і зусім не хочуць страшыць увесь свет вайной. Нам, хто жыве ў Канадзе, добра вядома, што адбывалася ў ЗША ў час вайны ў В'етнаме. Толькі ў Канаду перабегла больш за сто тысяч амерыканскіх дэзерціраў. А колькі было антываенных дэманстрацый! Часам яны заканчваліся кровапраліццем. Тады яшчэ людзі менш разбіраліся, хто сапраўдны віноўнік вайны. Але тое, што амерыканскія імперыялісты пастаянна нагнятаюць напружанасць у свеце, прымушае простых людзей задумвацца і разбірацца, адкуль у сапраўднасці ідзе зло. Гэта, вядома, не азначае, што ворагі чалавецтва ўжо абясшкоджаны. Не. За гэта нам трэба ўсім змагацца. І мы ганарымся тым, што асноўнай сілай у барацьбе за тое, каб вар'яты не зрабілі вар'яцтва, выступае Савецкі Саюз. Нават з іх уласнай прапагандысцкай балбатні можна зразумець, што, калі б не пастаянныя намаганні нашай Радзімы, накіраваныя на ўмацаванне міру і разрадкі на зямлі, яны ўжо не раз паўтарылі б у якой-небудзь краіне вопыт з Хірасімай, каб запалохаць іншыя народы і спакойна рабаваць іх. Сёння гэта разумеюць многія людзі нават у саміх Злучаных Штатах. Хочацца верыць, што сумеснымі намаганнямі нам удасца пазбавіцца ад злавеснай пагрозы вайны.

Аляксей ГРЫЦУК.

Канада.

For many years the peoples of the Byelorussian SSR and the Lithuanian SSR are the partners in the Socialist emulation. The representatives of the two republics regularly meet and discuss the results of the emulation and the measures to make it more effective.
On photo: The Honoured builder of the Lithuanian SSR Hero of Socialist Labour the leader of the complex team of builders from Panevezhis Antonas Smalikis and Hero of Socialist Labour team-leader of builders from Grodno Ivan Saley discuss the tasks of their collectives in the socialist emulation.

For Peace And Security

(THE BYELORUSSIAN PRESS ON THE RESULTS OF THE 36TH SESSION OF THE GENERAL ASSEMBLY: A REVIEW)

THE RESULTS of the 36th session of the General Assembly of the United Nations bear witness to the wide support by the states members of the Organization of a number of initiatives and proposals of the Soviet Union, other socialist states, nonaligned and peace-loving countries designed to prevent nuclear catastrophe, to curb and reverse the arms race, to dispose of the remnants of colonialism, racism and apartheid, to eliminate the hotbeds of tensions and to strengthen international security and détente.

Notwithstanding the further intended whipping up of international tension by imperialistic and hegemonistic forces, their attempts to inflate the myth of «the Soviet military threat», gross distortion of events in Afganistan and Kampuchea, the General Assembly succeeded in adopting a wide range of useful decisions.

The main achievements of peace-loving forces at the session of the General Assembly, as it is considered in the Byelorussian SSR, is the adoption at the proposal of the USSR of the Declaration on prevention of nuclear catastrophe by which the General Assembly on behalf of the states members of the U. N. solemnly proclaimed that states and statesmen that resort first to the use of nuclear weapons would be committing the gravest crime against humanity and that any doctrines allowing the first use of nuclear weapons and any actions pushing the world towards a catastrophe were incompatible with human moral standards and the lofty ideals of the United Nations.

It is emphasized that inspite of the direct pressure on the developing countries on the part of the main NATO countries and China, none of them voted against the adoption of the Declaration.

High importance is attached to the resolution in which the General Assembly, taking into account the draft Treaty on the Prohibition of the Stationing of Weapons of Any Kind in Outer Space, submitted by the Soviet Union, considered it necessary to prevent the spread of arms race to outer space by concluding an appropriate international treaty. The Byelorussian SSR was among the cosponsors of this resolution.

The General Assembly shared the world-wide concern on the production by the United States and intended deployment of nuclear neutron weapons by adopting the resolution, of which the Byelorussian SSR was a cosponsor, condemning these weapons as having inhumane affects and lowering the threshold to nuclear war. Commenting the decision of the General Assembly to request the Committee on Disarmament to start without delay negotiations with a view to concluding a convention on the prohibition of the production, stockpiling, deployment and use of nuclear neutron weapons, the newspapers recall that such a draft convention was submitted by the socialist countries to the Committee on Disarmament several years ago.

The Byelorussian SSR cosponsored two resolutions on chemical weapons in which the General Assembly, along with an appeal for resumption and successful conclusion of the negotiations on prohibition of all chemical weapons, for the first time called upon all states to refrain from production and deployment of binary and other new types of chemical weapons as well as from stationing chemical weapons in those states where there are no such weapons at present.

Special attention is devoted to the resolution on prohibition of the development and manufacture of new types of weapons of mass destruction and new systems of such weapons, adopted by the General Assembly at the initiative of the Byelorussian SSR. Inter alia, the new element of this resolution is stressed, i. e. an appeal to the states permanent members of the Security Council and other militarily significant states to make declarations, identical in substance, concerning the refusal to create new types and systems of weapons of mass destruction, as a first step towards the conclusion of a comprehensive agreement on this subject, bearing in mind that such declarations would be approved there after by a decision of the Security Council.

Much attention is devoted to other important resolutions on disarmament issues adopted at the initiative of socialist and nonaligned countries. Specifically emphasized among them are the new proposal concerning world-wide action for collecting signatures in support of measures to prevent nuclear war, to curb the arms race and for disarmament, as well as resolutions on the need of an early conclusion of the elaboration of a treaty prohibiting radiological weapons, on intensification of the current, resumption of the suspended and organization of new negotiations on effective international agreements on disarmament items, on the continuation of the preparation for the convening of the World Disarmament Conference and others.

Special importance is attached to the resolution on strategic arms limitation talks, which underlines the necessity to pursue these negotiations in accordance with the principle of equality and equal security, looking towards the achievement of an agreement which will provide for substantial reductions and significant qualitative limitations of strategic arms.

The press widely comments the resolutions adopted by the General Assembly on the problems of the Middle East, Palestine, Namibia and struggle against colonialism and apartheid. The Byelorussian SSR was among the cosponsors of the resolutions on the implementation of the Declaration on granting independence to colonial states and peoples, on its implementation by the specialized agencies and international organizations, on the condemnation of the activities of foreign economic and other circles which hamper the implementation of the said Declaration in Namibia and other territories, etc.

The Byelorussian SSR cosponsored 12 of the 16 resolutions of the General Assembly on struggle against apartheid.

Much attention is devoted to the decisions on human rights and other socio-humanitarian problems. It is indicated, inter alia, that the Byelorussian SSR was the initiator of the adoption of the resolution on the human rights and scientific and technological developments which calls for the use of the scientific and technological progress only for peaceful economic, social and cultural development.

The Byelorussian SSR cosponsored also two more resolutions on social and humanitarian problems. One of them calls for the conclusion of the elaboration of the draft convention on the rights of the child and another one urges all states to take appropriate measures for securing the implementation and the enjoyment by youth of human rights, particularly, the right to education and to work with the view to resolving the problem of youth unemployment. A resolution of this kind was adopted in the United Nations for the first time.

The newspapers stress the importance of the continuation of the work with the aim of an early elaboration of the World Treaty on the non-use of force in international relations, which is envisaged in the resolution adopted with the cosponsorship of the Byelorussian SSR.

In the whole, the Byelorussian SSR initiated or cosponsored 29 resolutions of the 36th session of the General Assembly.

It is estimated that the session adopted more than three hundred resolutions, and 139 of them were adopted in the result of the vote. The United States, says the estimate, did not support 115 resolutions, and this is a vivid indication of their growing isolation in the United Nations.

THE LARGEST MASS ORGANISATION

Extracts from the address by T. Y. Kiselev, Alternate Member of the Politbureau of the CC of the CPSU, First Secretary of the CC of the Communist Party of Byelorussia to the Fifteenth Congress of Trade Unions of Byelorussia.

The Congress of Trade Unions of Byelorussia is held at the time when the working people with ever growing enthusiasm do not spare efforts to realize the historic outlines of the XXVI Congress of the CPSU. The Soviet people welcome as their own the plans of the Party whose major concern is the benefit of man, the care for economic and defence might of the country, and the maintenance of peace: our people are fully resolved to realize these plans with success.

The activities of the trade unions and the business-like discussion, which takes place at the proceedings of the Congress, prove once again, that the trade unions of the Republic represent an important socio-political force. This is the largest mass organization of the working people. Through the trade unions millions of people are learning how to govern production, state and public affairs, how to manage socialist economy how to live and work the communist way. Nowadays there is no work collective where a trade union organization does not exist. The trade unions organizations work in the thick of the masses, they are active participants of the struggle for the realization of the socio-economic policy of the Party.

Reviewing the results of the work for the first year of the Five-Year Plan, T. Y. Kiselev, on behalf of the CC of the Communist Party of Byelorussia, the Presidium of the Supreme Soviet and the Council of Ministers of the Byelorussian SSR has thanked the workers, collective farmers, intelligentsia, all those who with their selfless labour ensure the steady development of economics and culture of the Republic.

The progressive methods of advanced workers is the property of all the people. To introduce progressive methods, to help every toiler to work as the front-rank people work to-day — this is the task. All means at the disposal of the trade unions — schools of progressive methods of work, schools of communist labour, tutorship, workmanship contests and reviews — should be utilized to realize this purpose.

We should thoroughly analyse and critically assess the results of the past year as a whole. All the achievements accumulated by advanced practice should be preserved, developed and miltiplied. It is no less important to clearly understand the reasons for the shortcomings, which have taken place, to do all that is necessary to overcome them.

What do we expect today of the trade unions is the organization of socialist emulation in the light of the decisions of the XXVI Congress of the Party and the November 1981 Plenary Meeting of the CC of the CPSU.

First, the socialist emulation should be concentrated on the realization of the major directive of the Party — to enhance the efficiency of the national economy and to improve the quality of work.

Second, the socialist emulation should play an important role in ensuring rational and thrifty use of raw materials, fuel and energy, finance and labour resources: it should contribute to our economy being economical.

Third, the socialist emulation should contribute to the communist education of the working people, to the hightening of self-discipline and efficiency, to the strengthening of state and labour discipline.

It is well known, that the growth of the productivity of labour is a decisive factor of the development of our economy and of the enhancement of its efficiency. Withih the current Five-Year Plan it should rise for the national economy of the Republic as a whole by 20,4 per cent. This rise will result in the relevant economy of labour corresponding approximately to the work of 750 thousand people. We have set a task of securing a further rise of production at the working enterprises without augmenting or even lessening the number of those employed. Is it feasible? Yes, it is. Last year the workers of 278 enterprises, 23 per cent of their total number, have reached an additional rise of production with a less number of employees, and 75 more enterprises have made it keeping the number of workers intact.

The vital concern of the trade unions is their active participation in the realization of the social programme outlined by the Party. The life itself proves it once and again: the production tasks are successfully fulfilled when the workers, the conditions of their labour and life are constantly taken care of. And that has become the rule and the standard of all our practical work.

While discussing the role of the trade unions in solving the social problems, we should stress the necessity of their more active work to imorove the living conditions of the working people, to develop the public catering at enterprises, to broaden the network of pre-school children facilities, to improve public health, sanatoria, rest homes and other recreation facilities, to build overnight sanatoria and tourist hostels.

The trade unions should care more for the working man — not only in the process of production, but also in the leisure time. Physical culture and sports, amateur art, technical creativity, tourism — here are the questions, to which the trade unions should attach even greater and deeper attention.

So there are plenty of tasks — big and small, but all necessary and important — for the trade unions to accomplish. They have been discussed at the Congress with care and diligence. In order to resolve them, it is necessary to further improve the work of all the trade union organizations, to perfect style and methods of their activities, to highten discipline and efficiency of the trade union work, to deeper engage the trade unions with the organization and education work directly in the work collectives.

The Central Committee of the Communist Party of Byelorussia is confident, that the trade unions of the Republic will further improve their work among the working people, will be ever active in their efforts to assist the Party organization of the Republic in the realization of the decisions of the XXVI Congress of the CPSU and the outlines of the Eleventh Five-Year Plan.

ШТО ПАКАЗАЛА РЭСПУБЛІКАНСКАЯ АЛІМПІЯДА ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

МАГУТНАЕ СЛОВА, ТЫ, РОДНАЕ СЛОВА!

АЛІМПІЯДА — гэта заўсёды спаборніцтва. Хто самы дужы, хто самы смелы і спрытны... Каго ўвянчае лаўравы вянок пераможцы...

Алімпіяда, пра якую пойдзе гаворка, не з'яўляецца выключэннем. Вучні сельскіх і гарадскіх школ рэспублікі спаборнічалі ў майстэрстве валодання словам, здольнасці да лінгвістычнага мыслення, ва ўменні дакладна, лагічна, паслядоўна, прыгожа пісаць і гаварыць на сваёй роднай мове. Галоўнае — валоданне мовай, а не праверка праграмных ведаў, як гэта звычайна адбываецца на алімпіядах па хіміі, фізіцы ці матэматыцы.

Рэспубліканскую алімпіяду школьнікаў па беларускай мове праводзіла Міністэрства асветы БССР, дапамагалі Беларускі дзяржаўны універсітэт, Акадэмія навук, Мінскі педагагічны інстытут і навукова-даследчы інстытут педагогікі. У гэтым конкурсе прыняло ўдзел 175 258 вучняў, амаль 95 тысяч з іх — сельскія школьнікі.

Спаборніцтва праводзілася па наступных этапах: спачатку ў школе, потым у раёне ці горадзе, у вобласці і, нарэшце, у рэспубліцы. На апошнім этапе ў Мінску ўдзельнікі алімпіяды павінны былі выканаць некалькі відаў работ. У першы дзень іх чакаў лінгвістычны пісьмовы конкурс, дзе вучням прапаноўвалася зрабіць фанетычны аналіз слоў, вызначыць іх марфемны склад і зрабіць словаўтваральны аналіз, выканаць сінтаксічны разбор словазлучэнняў у сказе, вызначыць стыль прапанаванага тэксту —усяго дзесяць пунктаў.

Два наступныя туры — пісьмовае сачыненне і вуснае выказванне на прапанаваную тэму. Бадай, гэты апошні конкурс быў самым складаным. Каб расказ атрымаўся змястоўным і эмацыянальным, дасканалым стылёва і выклікаў цікавасць журы, школьніку неабходна вельмі добра валодаць усімі выяўленчымі сродкамі мовы.

Вось як гэта атрымалася, напрыклад, у вучаніцы Дзюкаўскай сярэдняй школы Ляхавіцкага раёна Галі Грыгаровіч: **«Тэма майго вуснага выказвання,— пачала дзяўчынка, — «Слова на школьным літаратурным вечары, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы».**

Дарагія сябры, паважаныя настаўнікі! Вы ведаеце, што сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Наш школьны літаратурны вечар прысвечаны гэтаму вялікаму юбілею.

Янка Купала. Яго нарадзіла зямля Беларусі, каб потым ён закахаўся ў яе, ведаў тут кожнае дрэва, кожную травінку, бачыў, як наліваецца колас, зацвітае верас, выплывае месяц на сіні начлег.

Янка Купала. Яго нарадзіла зямля Беларусі, каб ён стаў барацьбітом за волю і шчасце працоўных, людзей цёмных і забітых і ў той жа час высакародных, духоўна багатых.

Паэзія Купалы — гэта не проста высокамастацкія, прыгожыя, мілагучныя вершы. Паэзія Купалы — своеасаблівая гісторыя жыцця беларускага народа, яго мар і надзей, яго барацьбы і перамог. Паэзія Купалы — гэта чароўны сад, у якім сабраны, як сказаў Якуб Колас, увесь водар беларускай зямлі. Пра што б ні пісаў Янка Купала, яго творы былі прысвечаны чалавеку. Яго вершы—гэта гімны, напоўненыя патрыятызмам, любоўю да сваёй радзімы.

Я ўпэўнена: няхай пройдзе яшчэ 100, яшчэ 300 гадоў, няхай мінуць тысячагоддзі, а паэзія Янкі Купалы будзе жыць, хваляваць і падрастаючае пакаленне, і людзей сталых. Таму што ў творах паэта —само жыццё».

А вось такім быў расказ вучня 35-й мінскай школы Лёні Кацнельсона: **«Сёння я хачу расказаць вам аб нашай Беларусі. Даўным-даўно, калі на гэтай зямлі гаспадарылі розныя прыгнятальнікі, беларускую мову забаранялі. Пісаць і размаўляць на ёй было нельга. Пачыналі гаварыць па-беларуску ў сваёй хаце, а канчалі ланцугамі ў астрогу.**

А вось сёння ў Араў-парку пад Нью-Йоркам стаяць чатыры помнікі — Уітмену, Пушкіну, Шаўчэнку і нашаму Янку Купалу. Беларуская мова існуе, яна не загінула тады. Ці ведаеце вы, якія мы, беларусы! Трэба вельмі любіць і краіну, і мову, каб знесці ўсе пакуты, што выпалі на нашу долю, і застацца гордымі.

Сёння ў нас ёсць мова, свая дзяржаўнасць. Мы шчыра адчыняем дзверы і запрашаем усіх сяброў да сябе. Беларусь —гэта перш за ўсё шчырасць да ўсіх».

Сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Як вядома, па рашэнню ЮНЕСКА ва ўсім свеце год беларускіх песняроў адзначаецца як грамадская, культурная, і нацыянальная з'ява. Таму, зразумела, многія заданні алімпіяды былі звязаны з гэтымі юбілеямі. Адказы на іх паказалі добрае веданне жыцця і творчага шляху нашых паэтаў, разуменне значэння іх літаратурнай спадчыны для развіцця культуры беларускага народа.

Тэмы работ (напрыклад, «Слова — радасць, слова — чары», Я. Колас. «Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, каб звонка звінела, была, як агонь», П. Броўка, «Роднае слова! Ты тлумачыш нам усе дзівы свету...», Цётка і інш.) давалі школьнікам магчымасць па-дзіцячаму непасрэдна, але шчыра, ад сэрца выказваць свае адносіны да мовы, якую яны чуюць з калыскі, якая гучыць у песнях і казках іх маці і бабуль.

«Нізкі паклон табе, родная мова,—піша Нэля Ардынская з Шаркаўшчынскай школы. — Дзякуй дзядам і бацькам, якія стварылі цябе. Сёння беларуская мова гучыць у тэатрах і клубах, у калгасе і на заводзе, у маім класе».

Алена Клімовіч з Аздаміцкай школы Столінскага раёна: «Лірычнасць нашай мовы, напеўнасць, прыгажосць схаваліся за сціпласцю і прастатой. ДЗЕНЬ. Калі я чую гэта слова, мне ўспамінаецца вясна, вясёлы звон ледзяшоў. Я ўяўляю жывое срэбра вясёлых раўчукоў. Мне наша мова здаецца самай багатай у свеце».

Для Раісы Гарэльчык з Дрычынскай школы і яе блізкіх беларуская мова з'яўляецца асноўным і пастаянным сродкам зносін, яна збліжае дзяўчынку з далёкімі продкамі і аб'ядноўвае мільёны ў цэлы народ.

Невялікае, але надзіва светлае сачыненне Надзі Шалупенькі з Мазыра. Мова дае ёй магчымасць сказаць цёплае пранікнёнае слова аб Радзіме: «Я нарадзілася і жыву ў сінявокай ад кветак лёну, залатакосай ад спелых хлябоў рэспубліцы — маёй роднай Беларусі,—піша дзяўчынка. — Хіба раскажаш пра стромкія сосны, якія адбіваюцца ў празрыстых азёрах і рэчках, пра чырвоныя пацеркі журавін, што з цікаўнасцю выглядаюць з-пад белага покрыву снегу, пра гордых буслоў?!»

Мова — з'ява сацыяльная. І гэты аспект таксама знаходзіць адлюстраванне ў дзіцячых работах. «Многія словы аджылі ўжо свой век і нам болей не патрэбны, — піша Таня Буглак з Докшыц, —гайдук, цівун, паншчына. Ну, навошта яны свабодным беларусам!»

Школьнікі старэйшых класаў, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскай алімпіядзе, добра ведаюць гісторыю свайго краю, народа, які з пакалення ў пакаленне змагаўся за такое натуральнае права «людзьмі звацца», мець сваю мову і вучыць на ёй сваіх дзяцей і якому Кастрычніцкая рэвалюцыя дала гэта права.

АЛІМПІЯДЫ, падобныя на тую, пра якую ідзе гаворка ў гэтым артыкуле, праводзяцца ў нашай рэспубліцы ўжо чатыры гады. Адзін раз руская, другі — беларуская, потым зноў руская і праз год беларуская. І ў той, і ў другой удзел прымаюць вучні беларускіх школ (іх у нас больш, чым рускіх) і школ, дзе выкладанне вядзецца на рускай мове, а беларуская — адзін з прадметаў школьнай праграмы. Гэтыя спаборніцтвы звычайна паказваюць, што вучні аднолькава добра валодаюць абедзьвюма роднаснымі мовамі.

— Дарэчы, а што засведчыла апошняя алімпіяда?

На маё пытанне адказвае прафесар Арнольд Міхневіч, старшыня журы алімпіяды:

— Я лічу, што гаварыць аб дасканаласці ранавата. Мова — прадмет вельмі складаны, патрабуе працяглага і паглыбленага вывучэння. Нашым ўдзельнікам, калі яны пажадаюць, гэтым трэба будзе займацца ў інстытутах, універсітэтах. Адным словам, справа бліжэйшай будучыні. Вынікі ж алімпіяды лічу вельмі станоўчымі. Мы бачым, што дзеці свабодна валодаюць беларускай мовай —размоўнай, пісьмовай, літаратурнай. Вы ж і самі чулі іх адказы, чыталі сачыненні. З задавальненнем успамінаю і мінулагоднюю алімпіяду па рускай мове. Матэрыялы яе, як і іншых, апрацаваны, паслужаць настаўнікам дапаможнікам у рабоце.

Аднолькавыя адносіны да моў, роўныя правы ў іх. Карані гэтай з'явы хаваюцца ў далёкім мінулым. З'ява гэта мае эканамічныя, культурныя, этнаграфічныя, нарэшце, гістарычныя аспекты. Іменна гістарычна склалася так, што руская мова вылучылася як мова міжнацыянальных зносін у нашай многанацыянальнай краіне, дзе толькі пісьмовых моў налічваецца 130, а ўсяго іх значна болей.

Наша Беларусь з'яўляецца тыповай рэспублікай з развітым двухмоўем. Гэта тлумачыцца характарам самой нашай мовы, яе структурай, блізкароднасцю з рускай. Аднак дзве мовы не проста мірна і плённа ўжываюцца, суіснуюць, яны пастаянна аказваюць уплыў адна на адну. Адбываецца так званы працэс інтэрферэнцыі, узаемадзеянне моў. Нядаўна ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук БССР, у сектары, якім загадвае А. Міхневіч, была абаронена дысертацыя «Лексічная інтэрферэнцыя ў перакладах беларускай паэзіі». У ёй ішла размова пра тое, што нават у самых лепшых перакладах на рускую мову захоўваецца вялікая колькасць беларусізмаў, якія маюць вельмі розныя функцыі. Гэта і ёсць прыклад жывога працэсу ўзаемадзеяння моў.

АЛІМПІЯДА закончылася. Яе ўдзельнікі, якія прыязджалі ў Мінск з самых аддаленых куткоў Беларусі, зноў селі за парты. Ужо не дзеля конкурсных балаў пішуць яны школьныя сачыненні, вывучаюць творчасць любімых пісьменнікаў — Максіма Багдановіча, Цёткі, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага і Аркадзя Куляшова. Дзеці заўсёды будуць памятаць, як, выступаючы перад імі на закрыцці алімпіяды, паэт Ніл Гілевіч сказаў: каб адчуваць сябе адукаваным чалавекам, быць патрыётам сваёй Бацькаўшчыны, трэба добра ведаць гісторыю, культуру, сваю мову.

Дзіяна ЧАРКАСАВА.

любыя сэрцу мясціны

ПРЫРОДА — КАЛЫСКА ЧАЛАВЕКА

(Заканчэнне. Пачатак у № 15).

Дарэчы, на Лагойшчыне многа месц, звязаных з імем Купалы. Гэта вёскі Гаяны, Мачаны, побач з ёй фальварак Казіміраўка, Харужанцы, Бараўцы.

Тут, на Лагойшчыне, у 1897—1898 гадах Янка Луцэвіч вучыўся ў Беларуцкім народным вучылішчы.

У Беларучах было так званае трохкласнае народнае вучылішча, куды ў пачатку зімы 1897 года, як толькі палі пакрыліся снегам, на звычайных санях прыехаў Дамінік Луцэвіч са сваім сынам Янкам, які быў прыняты ў апошні, трэці клас. А пазней Купала напіша вось гэтыя сумныя і шчырыя радкі:

Мне мудрасці кніжнай
не даў бог пазнаці,
Мой бацька не мог даць
раскошаў такіх—
Наўчаўся я слоў беларускіх
ад маці
І дум беларускіх
без школы і кніг.
Ад самай красы
маіх дзён невясёлых
Настаўнікам быў
беларускі абшар,
Усходы палеткаў і гоманы
ў сёлах
Навуку сваю мне прыносілі
ў дар...

Я. Купала ў аўтабіяграфічных лістах успамінае: «Калі мы жылі ў Селішчы, я пазнаёміўся з адным польскім панам Сігізмундам Чаховічам у маёнтку Малыя Бясяды. Памешчык гэты быў у свой час сасланы Мураўёвым у Сібір, але пасля вярнуўся і жыў у сваім маёнтку. У яго была велізарная бібліятэка, у большасці з польскіх кніг. Вось тут мне і адкрылася, што называецца, «скарбніца».

Хто ён, гэты памешчык, аб якім піша паэт? Чаховіч (Ляхавіцкі) нарадзіўся ў 1831 годзе ў маёнтку Сурвілішкі на Пастаўшчыне. З 1859 года жыў на Лагойшчыне ў маёнтку Малыя Бясяды. У 1862—1863 гадах Чаховіч з'яўляўся членам Літоўскага правінцыяльнага камітэта, саратнікам К. Каліноўскага па падрыхтоўцы і кіраўніцтву сялянскім паўстаннем. Да гэтага ён з выдатнай адзнакай закончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. За ўдзел у паўстанні быў арыштаваны і асуджаны 31 ліпеня 1863 года на 12 гадоў катаргі і сасланы на Нерчынскія рудзікі Сібіры. Потым атрымаў дазвол на пражыванне ў Іркуцку. Затым жыў у Пярмі, Смаленску, Варшаве. Пасля 6 гадоў свайго вандравання атрымаў дазвол пасяліцца на сваёй сядзібе ў Бясядах (Калдыкоўцы), дзе жыў у адзіноце ў невялікім драўляным флігелі сярод сваіх кніг.

У перыяд жыцця ў Бясядах і наведаўся да Чаховіча Я. Купала. «Часта ён мне выбіраў кнігі для чытання, — расказвае паэт, — а часам я сам прасіў у яго такіх або іншых аўтараў, апрача ўсяго роду паэзіі, якой я больш за ўсё захапляўся, белетрыстыкі, гісторыі і да т. п. У яго першага я пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай, якая больш за ўсё адносілася да польскага паўстання. Былі гэта выданні кракаўскія, лонданскія, парыжскія і інш.

Ці траплялася мне тады ў яго сацыялістычная літаратура, не памятаю, але памятаю добра, што чытаная тады мною нелегальная літаратура была ўся прасякнута нянавісцю да царызму і любоўю да свабоды і незалежнасці».

У бібліятэцы Чаховіча Купала знаходзіў адказы на грамадска-палітычныя пытанні. Ён шмат аб чым любіў гутарыць з Чаховічам, асабліва аб паўстанні 1863 года. Кнігі і гэтыя гутаркі пашырылі кругагляд юнака, абудзілі ў ім свабадалюбівыя імкненні.

Як вядома, на Лагойшчыне Янка Купала пазнаёміўся з пісьменнікам-сатырыкам і гумарыстам Ядвігіным Ш., які жыў у невялікім фальварку Карпілаўка, што побач з Селішчам.

Янка Купала называе Ядвігіна Ш. у ліку тых пісьменнікаў, што ў пачатку літаратурнага шляху заахвочвалі яго да мастацкай творчасці. У адным з пісьмаў ён успамінае: «У перыяд 1904—1906 гадоў... я пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. (жылі мы па суседству). Гэта была для мяне вялікая падзея, бо ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску. З Ядвігіным Ш. я вельмі зблізіўся. Ён шмат расказваў пра незнаёмыя мне да таго часу пісьменніцкія справы і г. д. Чалавек ён быў з вышэйшай адукацыяй (праўда, універсітэта з-за рэвалюцыйных спраў не скончыў), прытым вельмі цікавы і даступны субяседнік».

Як вядома, першыя паэтычныя спробы Янкі Купалы былі на польскай мове. Гэта вершы, якія ён пачаў пісаць у 1902—1903 гадах. Іх было напісана 22. Некаторыя з іх ён нават надрукаваў у 1903 годзе. «Але вось, — піша Купала ў лісце ад 21 верасня 1928 года,—трапляюцца мне ў 1904 г. ці ў пачатку 1905 г. рэвалюцыйныя пракламацыі на беларускай мове і кніжкі: «Дудка беларуская» Багушэвіча і «Гапон» ці іншая якая-небудзь кніжка Дуніна-Марцінкевіча... і ўсё маё польскае пісанне пайшло на змарку. З гэтага часу я пачынаю пісаць толькі па-беларуску...»

Акрамя Купалы, у Карпілаўцы былі Змітрок Бядуля, Уладзіслаў Галубок... У 1916 годзе, за паўгода да сваёй смерці, прыязджаў сюды і Максім Багдановіч.

Ад былой сядзібы Ядвігіна Ш., на жаль, засталіся толькі агульныя абрысы. Але куточак гэты захаваў адбітак сваёй колішняй прывабнасці. Яшчэ растуць старыя прысады з ліп, клёнаў, таполяў; засталіся ахоўныя палосы з елак, што некалі атулялі вялікі сад, пасаджаны пісьменнікам, чалавекам, які вельмі любіў прыроду.

ШЧАСЦЕ—ГЭТА АДЧУВАННЕ СВАЁЙ ПАТРЭБНАСЦІ ЛЮДЗЯМ, ГРАМАДСТВУ

ДВА ЖЫЦЦІ СКУЛЬПТАРА

У гэтага чалавека дзіўная біяграфія. І ў той жа час лёс, характэрны для мастака, які нарадзіўся на рубяжы дзвюх эпох.

Ён быў асабіста знаёмы з У. І. Леніным. Ён чуў Жана Жарэса, сядзеў побач з Агюстам Радэнам пры ўрачыстым адкрыцці яго «Мыслі-целя», ён зняў пасмяротную маску з Льва Талстога...

Нарадзіўся Сяргей Дзмітрыевіч Мяркураў у Александропалі (цяпер Ленінакан, Армянская ССР) 7 лістапада 1881 года. Вакол горада ўзвышаліся горы, ляпіліся скалы, ляжаў каменны лес.

З дзіцячых гадоў любіў будучы скульптар глядзець на работу каменячосаў. І на ўсё жыццё запомніў іх словы аб тым, што камень бессмяротны: з каменя быў дабыты першы агонь, на ім упершыню перамалолі зерне на муку, і калі ўсё ў свеце падуладна змяненням, то камень заўсёды нязменны.

Ён глядзеў на работу майстроў і вучыўся. Потым вырабляў вазу. Настолькі прыгожую, што яе вырашыў купіць хан Нахічэванскі. Для хлопчыка зрабілі выключэнне: дазволілі ўвайсці ў ханскі гарэм — першыя мастацкія заказы ў яго жыцці былі заказамі ханскіх наложніц...

Потым быў Цюрых. Філасофскі факультэт. Юнак з Каўказа хацеў пазнаць мудрасць і праўду. Але бацька яго, багаты александропальскі грэк, адчуў, што зусім не філасофія захапляе яго сына. «Не ўздумай стаць мастаком, — пісаў ён яму. — Мастакі жывуць на чацвёртым паверсе, і іх хаваюць за грамадскі кошт».

Так, прафесія мастака была ў Расійскай імперыі непрэстыжнай. Але Мяркураў цягнуўся да яе. Аднойчы на беразе цюрыхскага возера ён наткнуўся на дзіўную дачу. Па ўчастку бегала два дзесяткі такс, у куце працаваў скульптар. «Можна мне вучыцца ў вас?» — нечакана для самога сябе спытаў у мастака студэнт-філосаф. — «Чаму ж не? — адказаў той.—Толькі я патрабую безумоўнага падпарадкавання. Спачатку прыбярыце за сабакамі, потым іх накарміце».

Два тыдні Мяркураў даглядаў сабак, пакуль майстар не заўважыў задаволена: «У вас ёсць цярпенне». «Але я хачу нарэшце вучыцца», — узмаліўся Мяркураў. «Бярыце гліну і ляпіце, — адказаў скульптар. — Бо вы ўжо два тыдні каля мяне». Вучань адказаў усходняй прымаўкай: «Калі б ад глядзення можна было навучыцца, то ўсе сабакі на бойні даўно б сталі рэзнікамі...»

Скульптар — а гэта быў славуты Адольф Маер — доўга смяяўся. Потым загадаў, каб Мяркураў кінуў філасофію: мастацтва не церпіць саперніц. Цярпенне, назіральнасць, працавітасць — гэта галоўнае. Без іх талент — нішто. Маер быў добрым настаўнікам, Мяркураў — дастойным вучнем.

Неўзабаве Мяркураў паступае ў Мюнхенскую акадэмію. За скульптурную кампазіцыю «Музыка» яго ўзнагародзілі асобнай майстэрняй. З'яўляюцца заказы. Але стомленасць і пастаяннае недаяданне прыводзяць яго ў бальніцу. Майстэрню адбіраюць. Пачатыя работы выкідваюць.

Ён перабіраецца ў Парыж. Тут вялікая руская калонія. Жыве з выпадковых заказаў. Мары ўсё не збываюцца. «Маё сэрца, — піша ён, — прагнула знайсці натхненне ў сучаснасці. Але навокал была поўная апустошанасць».

Мяркураў вяртаецца на радзіму, пасяляецца ў Маскве. У лістападзе 1910 года па просьбе сына Льва Талстога здымае пасмяротную маску з вялікага пісьменніка. Аб ім пішуць газеты, але заказаў вельмі мала. У яго няма ўплывовых знаёмых. Дзверы выставак для яго закрыты. «Свой творчы шлях да рэвалюцыі, — заўважаў Мяркураў, — я прайшоў у адзіноце, у пакутлівым пошуку шляхоў, якія прывялі б да сапраўднага мастацтва...»

У 1917 годзе жыццё скульптара нібыта пачалося занава. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя шырока адкрыла дзверы яго майстэрні. Рэвалюцыйны ўрад набыў яго творы 1911—1919 гадоў — партрэты Талстога, Дастаеўскага і інш. Дзейнасць мастака атрымала сэнс і перспектыву.

У цэнтры творчых шуканняў Мяркурава стаў вобраз У. І. Леніна. Ён чуў выступленні Леніна яшчэ ў Цюрыху, у Маскве бываў ва Уладзіміра Ільіча, які заўсёды ставіўся да яго ўважліва, дапамагаў парадамі. Мяркураў стварыў некалькі ўвайшоўшых у гісторыю савецкага мастацтва помнікаў вялікаму правадыру. Найбольш вядомыя з іх — манумент, устаноўлены на Канале імя Масквы, і помнік у Калініне. У дакладных, лаканічных формах паўстаў вобраз, усім зразумелы, велічны і просты.

Мяркурава захапілі гераічныя вобразы. Кожная новая работа вырашала ў яго новую мастацкую задачу. «Еўрапейскія майстры канца мінулага і пачатку цяперашняга стагоддзяў, — адзначаў ён, — былі пазбаўлены пачуцця велічы, гарманічнай свабоды, унутранага парыву і адчування духоўнай магутнасці чалавека, тэма чалавека-Праметэя была ім чужой».

Сярод твораў Мяркурава — помнікі-бюсты ля Крамлёўскай сцяны на Краснай плошчы ў Маскве, помнік 26 бакінскім камісарам у Баку, помнікі саратніку Леніна Сцяпану Шаўмяну ў Ерэване і выдатнаму рускаму вучонаму Кліменту Ціміразеву ў Маскве, скульптурныя партрэты Пушкіна, Ламаносава...

...Ён гаварыў, што шчаслівы. Таму што набыў веру ў свой народ і яго будучае. Таму што набыў пачуццё сваёй неабходнасці.

Гаўрыіл ПЕТРАСЯН.

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

Прэм'ерай спектакля «Вішнёвы сад» парадаваў сваіх гледачоў Гродзенскі абласны драматычны тэатр. Пастаноўку вядомай п'есы А. Чэхава ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра Аляксандр Шалыгін, сцэнаграфія — Ксеніі Шыманоўскай.
НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля. У ролях: купец Лапахін — артыст М. ЕМЯЛЬЯНАЎ, памешчык Сімяонаў-Пішчык — заслужаны артыст БССР У. МІШКАНЧУК, Ранеўская — артыстка Л. КУЧАРЭНКА.

«РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО» НА ЭКРАНЕ

У Доме літаратара ў Мінску адбыўся грамадскі прагляд новага мастацкага фільма «Раскіданае гняздо». Гледачы, знаёмыя з творам народнага песняра Беларусі Я. Купалы па школьных хрэстаматыях, па спектаклях купалаўскага тэатра, з цікавасцю чакалі гэтую кінапрэм'еру, ажыццёўленую на студыі «Беларусьфільм».

Рэжысёр карціны Б. Луцэнка і аператар Ю. Елхаў расказалі пра задуму, якую імкнуліся ажыццявіць сродкамі кіно, пра тое, з якой адказнасцю працавалі над творам, што стаў нашай класікай.

Пасля прагляду карціны адбылося абмеркаванне кінатвора, у якім прынялі ўдзел пісьменнікі С. Грахоўскі, А. Кулакоўскі, Г. Колас, мастакі А. Марачкін, М. Купава, артыст Г. Гарбук і іншыя.

ПАМЯЦЬ ПРА М. БАГДАНОВІЧА

Гарадскі выканаўчы камітэт Саветаў народных дэпутатаў горада Горкага прыняў рашэнне ўстанавіць на будынку цяперашняга педагагічнага інстытута мемарыяльную дошку з наступным тэкстам: «У гэтым будынку былой Ніжагародскай гімназіі ў 1902—1908 гг. вучыўся выдатны прадстаўнік рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры, класік беларускай паэзіі Максім Багдановіч (1891—1917)».

Будынак педінстытута знаходзіцца на цэнтральнай плошчы горада — плошчы Мініна і Пажарскага, насупраць Ніжагародскага крамля. Гэтая частка горада — адна з любімых у гаркаўчан.

У Ніжагародскай гімназіі ў свой час выкладаў І. Ульянаў — бацька Леніна.

АДНОЎЛЕНА ЭКСПАЗІЦЫЯ

Адноўлена экспазіцыя мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Пінкавіцкай сярэдняй школе, дзе тры гады жыў і настаўнічаў паэт. Клапатліва захавалі людзі прыгажосць гэтых месц, якая натхняла паэта. Шумяць пад ветрам магутныя дрэвы, у глыбіні сада — невялікі драўляны дом. Цяпер сельскія дзеці вучацца ў новым будынку, а ў старым памяшканні пры рэстаўрацыі захавана першапачатковая планіроўка — два класы, жылы пакой паэта.

На стэндах — матэрыялы, якія расказваюць пра жыццё і творчасць вялікага беларускага пісьменніка, архіўныя дакументы пра яго рэвалюцыйную дзейнасць, пісьмы. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пінкавіцкай сярэдняй школы, адзін са стваральнікаў музея. І. Калоша запісаў успаміны людзей, якія ведалі Коласа.

У экспазіцыі музея сабраны выданні твораў Я. Коласа на беларускай, рускай і іншых мовах.

Упершыню з Лагойшчыны загучалі вершы і паэмы Я. Купалы аб цяжкай долі і беспрасветным жыцці беларускага сялянства ў дарэвалюцыйнай Расіі, загучалі абвінавачваючым актам супраць царызму і буржуазна-памешчыцкага ладу. Гэтаму аддаў ён жар свайго сэрца і свой талент. Дарэчы, 1913 год быў у творчасці Я. Купалы нечым падобным да болдзінскай восені ў творчасці А. Пушкіна. Росквіт драматычнай дзейнасці Я. Купалы прыпадае іменна на гэты перыяд, калі паэт стварыў тры цудоўныя сцэнічныя рэчы — «Паўлінка», «Прымакі» і «Раскіданае гняздо», — да якіх нібы падрыхтоўчымі працамі паслужылі дзве драматызаваныя паэмы — «Адвечная песня» (1908) і «Сон на кургане» (1910). Несумненна, што стварэнню такога інтэнсіўнага творчага настрою паспрыяла і родная Лагойшчына, яе прырода і людзі. Тут ён чэрпаў натхненне, фарбы і гукі, тут угледзеў прататыпы герояў сваіх драматычных твораў, у прыватнасці, неўміручай «Паўлінкі».

Мне, ураджэнцу Лагойшчыны, хочацца да гэтага дадаць толькі вось што: у п'есах Купалы адлюстравалася жыццё ўвогуле беларускай вёскі і, у прыватнасці, вёскі лагойскай. У матэрыялах музея Янкі Купалы ў Мінску захоўваюцца ўспаміны сястры паэта, Ганны Луцэвіч, якая, спасылаючыся на прызнанне брата, зробленае ім пасля пастаноўкі «Паўлінкі» ў Радашковічах, гаварыла, што ўсе ці амаль усе дзеючыя асобы «Паўлінкі» мелі сваіх рэальных прататыпаў. Гэта былі аднавяскоўцы і асабіста знаёмыя паэту людзі з ваколіц хутара Акопы.

Рэвалюцыйная барацьба, штодзённыя будні працоўных становяцца асноўнай тэмай і яшчэ аднаго паэта, драматурга і белетрыста, таксама выхадца з Лагойшчыны — Леапольда Родзевіча. Нарадзіўся ён у фальварку Кур'янаўшчына, што ў двух кіламетрах ад вёскі Хадакі, цяпер цэнтральнай сядзібы калгаса імя Будзённага. Яго вершы «Вайна вайне», «Песня паўстанца», «Гне галіны вецер» і іншыя сталі рэвалюцыйнымі песнямі, у 1912 годзе з-пад пяра васемнаццацігадовага юнака выйшла ў трох дзеях драма «Блуднікі». Гэта была адна з першых беларускіх сацыяльных драм, і напісана яна яшчэ да з'яўлення «Раскіданага гнязда» Янкі Купалы. Царская цэнзура забараніла ставіць яе на сцэне.

У часопісе «Полымя» за 1923 год паведамлялася, што ў нядзелю 25 лістапада 1923 года вадэвіль Родзевіча «Збянтэжаны Саўка» ставіўся студэнтамі універсітэта імя Ламаносава ў Маскве, у якім было арганізавана беларускае зямляцтва ў колькасці 300 чалавек. Гэтая ж камедыя неаднаразова ставілася таксама шматлікімі мастацкімі гурткамі на Беларусі, у тым ліку на Лагойшчыне.

Леапольд Родзевіч напісаў дзве многаактовыя драмы, дванаццаць драматычных сцэнак-аднаактовак, дзве кніжкі вершаў, каля васьмідзесяці апавяданняў, замалёвак, маналогаў. Усяго ён выдаў шэсць невялічкіх кніжак з драматычнымі творамі і вершамі. Зборнік вершаў «На паняволеных гонях» быў падпольна надрукаваны ў 1928 годзе віленскім выдавецтвам ЦК КПЗБ.

У канцы 1923 года, калі была створана Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, у склад ЦК КПЗБ увайшоў і Родзевіч. Потым ён нелегальна выязджае з Вільні ў Маскву і вучыцца там у Камуністычным універсітэце народаў Захаду, друкуе вершы ў альманаху «Шостыя ўгодкі», выдадзеным беларускай секцыяй гэтай навучальнай установы. Потым Родзевіч вяртаецца ў Вільню, дзе выбіраецца сакратаром падпольнага акругкома КПЗБ. Пэўны час ён працаваў сакратаром Гродзенскага акруговага камітэта КПЗБ, потым рэдактарам газеты ЦК КПЗБ «Чырвоны сцяг» і часопіса «Бальшавік» (орган ЦК КПЗБ).

Лагойшчына выпеставала і вядомага празаіка і паэта Змітрака Бядулю (Самуіла Плаўніка). Мэта і задачы мастацкай творчасці Змітрака Бядулі характарызуюць таксама выбар ім псеўданіма. У Беларусі бядулем называюць таго, хто ўвесь час бядуе. Пісьменнік з 1910 года падпісваецца псеўданімам Бядуля, абяцаючы гэтым самым бедаваць народнымі бедамі. Такія дарэвалюцыйныя апавяданні пісьменніка, як «Злодзей», «Сон Анупрэя», «Гора ўдавы Сымоніхі», «Пяць лыжак заціркі», «На каляды к сыну», «Летапісцы», «Малыя дрывасекі», напісаныя ў 1912—1914 гадах, — вялікае дасягненне беларускай прозы. Яшчэ і цяпер старэйшыя жыхары вёскі Пасадзец і навакольных вёсак могуць назваць прататыпаў гэтых шырока вядомых апавяданняў Змітрака Бядулі. Большасць яго твораў сёння лічацца класічнымі, хрэстаматыйнымі.

І ў савецкі час ураджайная на таленты зямля Лагойшчыны нарадзіла шмат дзеячаў літаратуры і культуры. Сярод іх—вядомы паэт і вучоны Ніл Гілевіч. Любоў да роднага краю і яго духоўных багаццяў, чыстыя і светлыя пачуцці маладых сучаснікаў, роздум над сённяшнім і заўтрашнім днём — галоўныя матывы паэзіі Н. Гілевіча.

З вёскі Задроздзе паходзіць адзін з вядомых беларускіх празаікаў Іван Пташнікаў. Яго пяру належыць раман «Чакай у далёкіх Грынях», аповесці «Лонва», «Тартак» і шэраг апавяданняў, якія прыйшліся да сэрца чытачу. Пташнікаў — сапраўдны майстар, ён адчувае ўсе шэпты і шолахі маці-прыроды, і не толькі адчувае, але і ўмее перадаць іх, стварыць адпаведны настрой. Творы І. Пташнікава вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

На дарогах Лагойшчыны заўсёды шмат турыстаў і падарожнікаў. Іх вабяць сюды і купалаўскія сцежкі, і прыгажосць гэтага куточка зямлі, які так шмат даў для абуджэння і росквіту творчасці ўсіх яе выхадцаў.

Савелій АКУЛІЧ.



Вясна ўпэўнена набірае сілу. Званчэй спяваюць ручаіны, ярчэй свеціць сонейка. З выраю вяртаюцца птушкі. Самыя шматлікія візіцёры ў гэты час — берасцянкі. Да іхніх вялікіх чародак далучаюцца і юркі. З кожным днём з'яўляюцца ўсё новыя і новыя госці: вяхіры, клінтухі, канькі, жоўтыя сітаўкі, пеначкі. А начамі ляцяць дразды, малінаўкі. Удзень яны кормяцца па лугах і праталінах сярод хмызнякоў, адпачываюць на дрэвах у светлых гаях, спяваюць. На дзённых прыпынках збіраецца шмат птушак, і гоман там стаіць незвычайны. Увечары ж, пасля заходу сонца, начныя падарожнікі зноў збіраюцца ў дарогу. Услед за драздамі і малінаўкамі ляцяць жураўлі. Нікога не пакіне раўнадушным іх паднябесны кліч — курлыканне, якое звычайна супадае са зменай надвор'я на больш цёплае.

Канюкі, кнігаўкі, траўнікі, чарнышы, кулікі — усіх паветраных гасцей і не пералічыш.

Але красавік — гэта не толькі час птушыных свят, гэта і новыя прыемныя клопаты нам, людзям. Птушкі чакаюць нашай дапамогі...

Добра падрыхтаваліся да іх сустрэчы ў Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага ў Мінску. Нядаўна тут прайшло гарадское свята «Дзень птушак», у якім прынялі ўдзел каля 400 школьнікаў з усіх раёнаў беларускай сталіцы. Яны выставілі шматлікія экспанаты, выкананыя сваімі рукамі, змайстравалі дзесяткі шпакоўняў, якія развешаны на дрэвах парка.

НА ЗДЫМКАХ: юныя сябры птушак са шпакоўнямі; вучні мінскай сярэдняй школы № 126 са сваімі экспанатамі.

Фота П. НАВАТАРАВА.

ЗАЕЧЫЯ ТАНЦЫ

— Вы бачылі, як танцуюць зайцы?

Такое пытанне задаў мне аднойчы знаёмы ляснік. І адразу прапанаваў паглядзець на незвычайны баль.

Быў канец лютага. Ночы стаялі марозныя, зорныя. Таму, не адкладваючы, я вырашыў з'ездзіць да яго, каб самому стаць сведкай заечых рытуалаў.

І вось мы ў леснічоўцы. З аднаго боку да яе падступае бярозавы гаёк, які затым пераходзіць у сасняк. З другога — невялічкае, парослае хмызняком балотца адгарожвала домік ад поля. Густым алешнікам і ляшчынай зарасла і старая высечка, што цягнулася міма балота аж да гаю. А перад самай леснічоўкай— амаль круглая палянка. Яе калісьці выпрацавалі, акультурылі і ператварылі ва ўрадлівую нівачку. Добра радзіла тут бульба, сеялі азімае жыта. Іменна гэту нівачку выбралі для сваіх шлюбных гульняў зайцы. Прыбягалі яны сюды штоноч паласавацца азімінай, пагуляць пад месячным святлом.

Сцямнела, як заўсёды на Палессі, хутка. Здавалася, што цемень будзе такой непраглядная, што мы так нічога і не ўбачым.

Апоўначы неба на ўсходзе пасвятлела, з-за велізарнай сасны, што высока ўзняла сваю крону на краі лесу, павольна і велічна выплыў месяц.

Заяц з'явіўся з таго боку, адкуль мы яго і не чакалі. Нетаропка, злёгку перавальваючыся, ён дробнымі скачкамі прабег з-за вугла леснічоўкі. Перад акном стаў на заднія лапы, натапырыў вушы, з цікаўнасцю азірнуўся. Здавалася, ён хацеў зазірнуць у хату: хто там ёсць?

З-за другога вугла гэтак жа нетаропка выбег яшчэ адзін звярок. Яны сышліся, пакланіліся разам, абеглі па чарзе адзін аднаго і падаліся на нівачку. Там, на невялічкім, ледзь прыкметным пагорачку, у час нядаўняй адлігі растаў снег і выразна чарнела свежая рунь.

Доўга назіралі мы за звяркамі. Да іх далучыліся яшчэ два, потым яшчэ адзін. І што тут пачалося! Зайцы то ўзніміліся на заднія лапкі, то ганяліся адзін за адным, куляючыся ў снезе. Зусім бы тыя дзеці.

Напэўна, зайцы балявалі б так да самага ранку, але нейкая цень мільганула ў месячным святле, і звяркі ў момант разбеглі-ся. Цень пагналася за адным з іх, але той аказаўся больш спрытным і схаваўся ў гушчары.

— Сава, — пацвердзіўшы маю здагадку, ціха прамовіў ляснік.— Звычайна яна не палюе на зайцоў. Сёння ж відаць, згаладнела моцна, калі кінулася на такую буйную здабычу.

Колькі мы ні чакалі, больш на паляне зайцы не паказваліся. Можа вырашылі, што на сёння хопіць весяліцца, а мо пабеглі ў спакайнейшае месца...

Пра гісторыю гэту ўспомніў я нядаўна. Сустрэў на вуліцы мяне той самы ляснік.

— Памятаеш, цёзка, заечыя танцы?—першым пачаў ён гаворку. — Дык вось: не танцуюць яны больш у мяне перад акном. Мінулай восенню расказаў я пра іх аднаму знаёмаму з горада, паляўнічаму. Падзівіўся той, а сам, бачу, загарэўся аж. Вочы так і заблішчэлі. Пашкадаваў я тады, што сакрэтам сваім, сваёй радасцю падзяліўся. Ды позна ўжо было.

Той жа добра запомніў мой расказ. І аднойчы ноччу прачнуўся я ад шуму. Глянуў у акно і знямеў: хтосьці на матацыкле на нівачку нясецца, а ў святле фары зайчыкі ў здранцвенні застылі, не ведаюць, куды ўцякаць. Грымнуў стрэл, другі...

Як быў, распрануты, выскачыў на вуліцу. Нават холаду не заўважаю. Матацыкл жа тым часам да мяне пад'язджае, спыняецца, і саскокваё з яго той самы знаёмы. Задаволены, у руках па зайцу трымае.

— Віншуй,— кажа, — з трафеямі. Вось адзін табе, за падказку.

І шырокім жэстам кідае да маіх ног вялікага шэрака.

Не памятаю, што гаварыў тады я яму. Усю горыч, што на душы ўскіпела, выказаў.

Забралі потым у гэтага гора-паляўнічага ружжо, выключылі з радоў таварыства, матацыкл, як сродак браканьерства, канфіскавалі...

Часта ўспамінаю я заечыя танцы і быццам зараз бачу вочы лесніка. Якім шчасцем, якой радасцю свяціліся яны ў тую месячную ноч і якім болем поўніліся, калі стары прыгадваў выпадак браканьерства! І я думаю: «Ну што, здаецца, тут такога. Ну скачуць зайцы па снезе, весяляцца, грэюцца на марозе. А для людзей, што па-сапраўднаму любяць свой край, Радзіму, гэта сэнс жыцця. Вялікі сэнс...»

Васіль ЖУШМА.

Спорт

ВЯРНУЛІ ГАНАРОВЫ ТРАФЕЙ

У сталіцы Вялікабрытаніі завяршыўся чарговы розыгрыш Кубка Еўропы па скачках у ваду. Гэтыя спаборніцтвы сабралі мацнейшых спартсменаў кантынента з 18 краін.

Агульнакамандную перамогу атрымалі спартсмены Савецкага Саюза. Ім і быў уручаны (пасля гадавога перарыву) ганаровы трафей.

Знамянальна, што з васьмі савецкіх удзельнікаў чацвёра — мінчане. Гэта заслужаныя майстры спорту Аляксандр Партноў і Уладзімір Алейнік, майстар спорту міжнароднага класа Ірына Сідарава і дэбютантка спаборніцтваў такога ранга юная Вольга Хінко.

ПАМЯЦІ БАЦЬКІ МІНАЯ

Памяці легендарнага беларускага партызана Міная Шмырова (бацькі Міная) быў прысвечаны традыцыйны лёгкаатлетычны крос, які прайшоў у Віцебску.

Галоўны прыз разыгрываўся на дыстанцыі 20 кіламетраў. Першым на фініш быў І. Парлуй са Смаленска. Другое месца ў віцябчаніна У. Котава, а трэцім стаў С. Бачтароў з Мінска.

У камандным заліку перамаглі красмены Віцебска.

У мінскай танцавальнай зале комплексу «Вільнюс» два дні праходзіў традыцыйны конкурс сучасных бальных танцаў «Веснавыя рытмы-82».

Сюды з'ехаліся ўдзельнікі з Ленінграда, Вільнюса, Еўпаторыі і іншых гарадоў Савецкага Саюза.

Спаборніцтвы праходзілі па праграмах заходнееўрапейскіх і лацінаамерыканскіх танцаў.

Лепшымі ў класе «А» былі Арон і Таццяна Рубіны з Мінска.

НА ЗДЫМКАХ: пераможцы А. і Т. РУБІНЫ; танцуюць вучні пачатковых класаў.

Фота С. КРЫЦКАГА.

СВЕТ У АБ'ЕКТЫВЕ ФОТААМАТАРАЎ

Мірныя зямныя клопаты чалавека — змест усіх работ міжклубнай выстаўкі «Міні-фота-82», якая прайшла ў Магілёве. У экспазіцыі было каля 400 здымкаў 258 аўтараў з усіх рэспублік Савецкага Саюза і дваццаці краін Еўропы, Азіі і Амерыкі. У аб'ектыве фотааматараў — людзі працы, навакольны свет, прырода. Здымкі вызначаюцца вялікай разнастайнасцю форм і жанраў, высокім майстэрствам.

Галоўны прыз выстаўкі журы прысудзіла Вільнюскаму аддзяленню таварыства фотамастацтва Літоўскай ССР за самую вялікую калекцыю і найбольшую колькасць адзначаных работ. Узнагарод удастоены фотаклубы і аматары Украіны, Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Францыі і Італіі. У ліку пераможцаў — народны фотаклуб «Мінск» і гомельскі фотаклуб «Камера», адзначаныя дыпломамі і медалямі выстаўкі. Акрамя таго, гамяльчане ўзнагароджаны яшчэ і спецыяльным прызам часопіса «Советское фото».

Ініцыятарам і арганізатарам гэтай выстаўкі стаў магілёўскі народны фотаклуб «Вясёлка», які адзначае сёлета сваё дзесяцігоддзе. За гэтыя гады аматары знялі 55 фільмаў, арганізавалі многа міжклубных выставак фатаграфіі, якія сталі ўжо традыцыйнымі. Работы саміх членаў клуба дэманстраваліся на трох сотнях міжнародных выставак і ўдастоены ста дыпломаў і медалёў.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80; 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Зак. 811